ЖУРАЎЛІНАЯ ЭЛЕГІЯ



ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Па гарызанталі: 1. Кліч. **2.** Герб. **4.** Неба. **6.** Край. **8.** Шпак. **9.** Салдаты. **13.** Дзік. **16.** Хруст. **17.** Лісты. **18.** Зямля. **20.** Пачатак. **22.** Ра. **23.** Яд. **24.** Дакладчык. **25.** Адна. **26.** Гоні.

Па вертыкалі: 1. Кунтуш. **3.** Байбак. **5.** Беларусь. **7.** Радзіміч. **10.** Аул. **11.** Дастатак. **12.** Тры. **14.** Сто. **15.** Азы. **16.** Хмарка. **19.** Ягадкі. **20.** Плач. **21.** Крык.

Па гарызанталі: 1. «Ляціць, ляціць па небе ... змарнелы, // Ляціць у тумане на зыходзе дня». З верша дагестанскага паэта Р. Гамзатава «Жураўлі», у якім сцвярджаецца, што загінулыя ў апошнюю вайну салдаты ператварыліся ў белых жураўлёў; Дзень Белых Жураўлёў па прапанове паэта штогод адзначаецца 22 кастрычніка. **2.** Эмблема дзяржавы, горада. Выяву двух жураўлёў змяшчае ... г. Ганцавічы Брэсцкай вобласці. **4.** «Надзьмулася ... — // У небе восень». З верша Л. Паўлікава «Лістапад». **6.** «Жораў, шэры журавель, // Ты з якіх ляціш зямель? // — Я пакінуў ... заморскі // І лячу ў свой прыдняпроўскі». З верша М. Калачынскага «Размова з жураўлём». **8.** «... на дубе расспяваўся, // Жураўлі ўжо ляцяць». З верша Я. Коласа «Вясна». **9.** «Сыходзяць у вечнасць паўшыя ... , // Растаў у небе жураўліны клін». З верша С. Акулава «Жураўлі над вайной». **13.** Вепр. **16.** Трэск ад чаго-небудзь, што ламаецца. **17.** «З буйных ліп і бяроз // ... валяцца». З верша Я. Купалы «Лістапад». **18.** «Дзе б ні быў, ні лётаў я — // Мне радней мая ... ». З верша Н. Галіноўскай «Журка-журавель». **20.** «Калі ... пералёту // Абвесцяць звонка жураўлі». З верша С. Грахоўскага «Зачараванасць». **22.** Бог Сонца ў старажытным Егіпце. **23.** Кожны гад мае свой ... *(прык.)*. **24.** Той, хто робіць даклад. **25.** ... ў жураўлёў дарога — на цёплыя воды *(прык.)*. **26.** Адрэзак паласы ворнай зямлі *(устар.)*.

Па вертыкалі: 1. Старадаўняя адзежына ў выглядзе кафтана. **3.** Жывёліна атрада грызуноў, якая, як і сурок, барсук, мядзведзь, вожык, упадае ў зімовую спячку. **5.** «Каб любіць ... нашу мілую, // Трэба ў розных краях пабываць». З песні «Жураўлі на Палессе ляцяць» (сл. А. Ставера, муз. І. Лучанка). **7.** Прадстаўнік усходнеславянскага племені, якое некалі жыло ў міжрэччы Дняпра і Дзісны. **10.** Паселішча на Каўказе. **11.** ..., ці дабрабыт. Некалі носьбітам яго лічылі жураўля; убачыўшы яго, казалі: «Будзь здароў!». **12.** «У балоце на купенні // Журавіна спее. // Адзін мяне верна любіць, // ... – чатыры млее». Прыпеўка. **14.** «Абляцеў журавель // Мораў... , сто зямель». З верша П. Варанько «Абляцеў журавель» **15.** Пачатковыя веды. **16.** «... ў сінім небе тае. // Мкнуць у вырай жураўлі». З верша С. Новіка-Пяюна «Залатая восень». **19.** «Вельмі любіць журавель // ...-кіслінкі». З верша А. Дзяружынскага «Журавінкі». **20.** «Як птушка, душа ўстрапянецца, // Пачуўшы ... жураўліны». З верша М. Маляўкі «Покуць». **21.** «Зноў кастрычнік фарбуе палеткі, // У небе ... журавоў, як званок». З верша А. Анісовіча «Дзівак».

Склаў Лявон ЦЕЛЕШ,
г. Дзяржынск.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	8.04	17.42	9.38
Віцебск —	7.57	17.28	9.31
Магілёў —	7.54	17.32	9.38
Гомель —	7.47	17.33	9.46
Гродна —	8.18	17.57	9.39
Брэст —	8.15	18.02	9.47

Месяц

Апошняя квадра
28 кастрычніка.
Месяц у сузор'і Льва.

Імяніны

Пр. *Івана, Лонгіна, Яўгена.*
К. *Віялеты, Серафіны, Міхала, Нарцыза, Тодара.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



Даты Падзеі Людзі

29 КАСТРЫЧНІКА

У краіне

1811 год — нарадзіўся (в. Кукавячына Віцебскага раёна) Аляксандр Феліксавіч Рыпінскі, беларускі паэт, фальклярыст, графік, кнігавыдавец. У 1829—1930 гадах вучыўся ў школе прапаршчыкаў у Дынабургу (цяпер Даўгаўпілс, Латвія), дзе пасябраваў з В. Кюхельбекерам. Удзельнік паўстання 1830—1831 гадоў. Ратуючыся ад катаргі, эміграваў у Францыю, дзе зблізіўся з А. Міцкевічам. Быў абраны членам французскай Акадэміі прамысловасці, сельскай гаспадаркі, рамёстваў і гандлю. Выдаў фальклярыстычна-этнаграфічнае даследаванне «Беларусь», у якім упершыню ў гісторыі беларусістыкі сістэматызаваў вусную творчасць беларускага народа па жанрах і тэматыцы. З 1846 года ў Лондане, дзе займаўся выдавецкай і творчай дзейнасцю, выкладаў мовы, матэматыку і маляванне. Сам афармляў уласныя кнігі, праявіў выключныя здольнасці да мастацкай фатаграфіі, стаў адным з піянераў фотамастацтва. Пасля амністыі вярнуўся на Радзіму, працаваў над гісторыяй беларускай літаратуры.

1938 год — нарадзіўся (в. Малая Кракотка, цяпер у Слонімскім раёне) Янка Саламевіч (Іван Уладзіміравіч), беларускі літаратуразнавец, фальклярыст, бібліёграф, перакладчык, кандыдат філалагічных навук. Аўтар манаграфіі «Міхал Федароўскі», «Слоўніка беларускіх псеўданімаў (XVI—XX стст.)». Складальнік зборніка «Беларускія казкі» і іншага. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР.

У свеце

1565 год — Іван Фёдараў разам з Пятром Мсціслаўцам выдалі ў Маскве «Часаслоў» (другое выданне), які выкарыстоўваўся пры пачатковым навучанні грамаце.

1863 год — на канферэнцыі ў Жэневе (Швейцарыя) заснаваны Міжнародны Чырвоны Крыж.

1918 год — на I Усерасійскім з'ездзе саюзаў рабочай і сялянскай моладзі ўтвораны Расійскі камуністычны саюз моладзі (РКСМ), які ў 1924 годзе стаў Ленінскім, з 1926 года — Усесаюзным.

1929 год — дзень біржавога краху Уол-Стрыт, вядомы як «Чорны аўторак».

1945 год — нарадзіўся Мікалай Станіслававіч Казак, савецкі і беларускі фізік, акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктар фізіка-матэматычных навук, заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь. Аўтар больш чым 320 навуковых прац, 41 вынаходкі. Навуковыя працы па крышталяоптыцы, крышталяакустыцы і нелінейнай оптыцы.

Так гаварыў...

Вільгельм ГУМБАЛЬТ:

«Ліберал можа стаць міністрам, але з гэтага не вынікае, што ён будзе ліберальным міністрам».

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс);
аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы
тэл./факс: 311 17 27,
e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 2621.

Нумар падпісаны ў 19.30 28 кастрычніка 2021 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12